Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(63), 2010

*УДК 930(438):94(438:470):327”19”*

# Польская гістарыяграфія польска-савецкіх адносін: этап станаўлення

М. М. Мязга

Гістарычнай навуцы заўсёды належала вялікая роля ў фарміраванні грамадскай свядомасці па пытаннях палітычнага жыцця. Яна часта выступае з абгрунтаваннем знешнепалітычных мэтаў розных дзяржаў. Гэта ў поўнай меры адносіцца да польскай гістарыяграфіі перыяду станаўлення і першых гадоў існавання незалежнай Польшчы пасля першай сусветнай вайны. У працах польскіх гісторыкаў тых гадоў выразна прасочваецца імкненне не проста даследаваць важнейшыя аспекты польска-савецкіх адносін, але і абгрунтаваць знешнепалітычныя планы і крокі Польшчы на ўсходзе.

У айчыннай, савецкай і постсавецкай навуцы даследчыкі практычна не звярталіся да даследавання польскай гістарыяграфіі польска-савецкіх адносін у першыя гады яе развіцця. Звычайна гістарыяграфічныя агляды па праблеме польска-савецкіх адносін міжваеннага часу канцэнтраваліся на дасягненнях і недахопах польскай гістарыяграфіі перыяду пасля другой сусветнай вайны. Спецыяльным даследаваннем па гісторыі польскай гістарычнай навукі з’яўляецца праца Л. А. Зашкільняка [1]. Аўтар, разглядаючы вывучэнне розных гістарычных праблем у польскай міжваеннай гістарыяграфіі, адзначае, што яна шмат увагі надавала вывучэнню і польска-савецкіх адносін. Цікавасць да гэтай праблемы, на яго думку, асабліва ўзмацнілася ў 1930-я гады ў сувязі з тым, што ўсходні напрамак стаў прыярытэтным у знешняй палітыцы “санацыі” [1, с. 54].

У гістарыяграфічных аглядах да манаграфій, бадай што, найбольш грунтоўны аналіз гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін зрабіў у сваёй працы П. Н. Альшанскі. Аднак і ён акцэнтуе ўвагу на пасляваеннай гістарыяграфіі [2, с. 6–7]. Манаграфія І. В. Міхуцінай “Савецка-польскія адносіны 1931–1935” утрымлівае дастаткова падрабязны агляд як савецкай, так і польскай гістарыяграфіі. Але, зноў жа, аўтар акцэнтуе ўвагу на дасягненнях савецкай і польскай гістарыяграфіі, пачынаючы з часоў другой сусветнай вайны. Гістарыяграфію міжваеннага часу яна не палічыла неабходным зрабіць аб’ектам свайго даследавання, хаця і адзначае пры аналізе польскай эміграцкай гістарыяграфіі пасля другой сусветнай вайны, што яна працягвала гістарыяграфічныя традыцыі міжваеннага часу [3].

У дадзеным артыкуле мы паспрабуем высветліць, якія аспекты польска-савецкіх адносін і ў якой ступені знайшлі сваё адлюстраванне ў польскай гістарыяграфіі перыяду 1918 – 1926 гадоў, і на колькі погляды польскіх гісторыкаў былі звязаны з ідэйна-палітычнай барацьбой, якая адбывалася паміж савецкай Расіяй і Польшчай.

Літаральна з моманту адраджэння незалежнай Польшчы польская гістарыяграфія звярнулася да даследавання гісторыі ўсталявання польска-савецкай граніцы. Пры вывучэнні гэтай праблемы, польская гістарыяграфія, напэўна, у найбольшай ступені выконвала палітычны заказ. Польскія палітыкі яшчэ ў час першай сусветнай вайны пачалі выступаць з праектамі граніцы адроджанай Польшчы. У польскай гістарыяграфіі прыгадваецца дэкларацыя Р. Дмоўскага, з якой ён звярнуўся да прэм’ер-міністра Англіі і прапанаваў правесці польскую ўсходнюю граніцу па лініі Вільна, Дзвінск, Мінск, Пінск, Роўна, Камянец-Падольскі. Пры гэтым адзначаецца супярэчнасць пазіцыі Дмоўскага. З аднаго боку, ён указваў, што сіла Польшчы ў тэрыторыі, на якой пануе польскае насельніцтва, а з другой – прапаноўваў граніцу, якая значна выходзіла за этнічныя межы Польшчы [4, с. 54–55]. Адным з першых дакументаў, як вынікае з работ польскіх гісторыкаў першай паловы 1920-х гадоў, у якім таксама выказваліся польскія планы адносна граніц адроджанай дзяржавы, быў і праект С. Грабскага. Ён прадугледжваў граніцу Польшчы, якая ўключала на ўсходзе не толькі Вільню, але і По-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лацк, Мінск, Каменец-Падольскі. Пры гэтым Грабскі выступаў ад імя Польскага нацыянальнага камітэта ў Парыжы, які меў намер дабівацца ўказанай лініі ўсходняй граніцы на Парыжскай мірнай канферэнцыі.

Польскія гісторыкі і публіцысты ў сваіх працах літаральна з моманту адраджэння польскай дзяржавы сталі выступаць з абгрунтаваннем неабходнасці ўключэння ў яе склад вялікіх літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх тэрыторый на ўсходзе. Так, Я. Чэканоўскі спрабаваў даказаць у сваёй працы, што нават некаторыя паветы Магілёўскай і Віцебскай губерняў належаць да польскай этнічнай тэрыторыі і выказваў шкадаванне, што па Рыжскаму дагавару яны засталіся на расійскім баку граніцы [5, с. 29–30]. Польская гістарыяграфія робіць выснову, што на ўсходзе Польшча імкнулася дабіцца прымальнай граніцы ўзброеным шляхам. Па словах С. Грабскага, вайна 1919–1920 гадоў з савецкай Расіяй была перш за ўсё вайной за граніцы [6, с. 101].

С. Кутчэба адзначае ў якасці аднаго з ключавых момантаў, які вызначаў палітыку Польшчы па пытанні граніцы, тое, што яна вымушана была лічыцца з пазіцыяй Антанты, якая ўзяла на сябе права рэгуляваць пытанне ўсходняй граніцы Польшчы [7, с. 164]. Пры гэтым польская гістарыяграфія адзначае, што ўжо ў пачатку Парыжскай канферэнцыі стала зразумелым, што саюзнікі пагадзяцца перадаць Польшчы спрэчныя з Расіяй тэрыторыі толькі на аснове пагаднення паміж Польшчай і Расіяй. Для Польшчы было непрыемным, што канферэнцыя ў рэшце рэшт так і не рашылася вызначыць польска-расійскую граніцу. Заўважым, што ў польскай гістарыяграфіі ўсходняя граніца Польшчы вызначаецца як граніца менавіта польска-расійская [4, с. 68, 94–95]. Далей, ацэньваючы канцэпцыі інкарпарацыі і федэрацыі з пункту гледжання ўсталявання польскай усходняй граніцы, С. Кутчэба ўказвае, што яны не ўлічвалі несамастойнасці Польшча ў вызначэнні сваёй граніцы. Гэта было слабым месцам абедзвюх канцэпцый. Асабліва моцным, на яго думку, быў ціск вялікіх дзяржаў на Польшчу па пытанню аб далучэнні Усходняй Галіцыі [7, с. 168, 170–171].

Большасць польскіх гісторыкаў і публіцыстаў пагаджаюцца з тым, што ў пытанні аб граніцах у рэшце рэшт перамагла канцэпцыя інкарпарацыі эндэцыі, а не праграма ПІЛСУДСКАГА. Гэта, у прыватнасці, адзначае ў сваіх работах С. Грабскі. Прычыну такога ходу падзей ён бачыць у тым, што канцэпцыя інкарпарацыі "абапіралася на польскі патрыятызм, а палітыка Пілсудскага спрачалася з ім на кожным кроку". Для Польшчы важнай праблемай было прызнанне вялікімі дзяржавамі той граніцы, якую ўсталяваў Рыжскі дагавор. У сувязі з гэтым С. Грабскі выказвае меркаванне, што важнейшым знешнепалітычным дасягненнем урада В. Сікорскага было атрыманне міжнароднага прызнання ўсходняй граніцы Польшчы [6, с. 102]. С. Грабскі бачыць значэнне прызнання граніц Саветам паслоў Антанты ў тым, што яно забяспечвае Польшчу ад узняцця на міжнародным узроўні пытання аб граніцы паслябальшавіцкай Расіяй [6, с. 101].

У цеснай сувязі з праблемай усталявання ўсходняй граніцы Польшчы польская гістарыяграфія разглядае гісторыю польска-савецкай вайны 1919 – 1920 гадоў. Асаблівая ўвага звяртаецца на даследаванне магчымасцей мірнага урэгулявання канфлікта ў канцы 1919 – пачатку 1920 г. С. Кутчэба прызнае, што ініцыятыва мірных перамоў у гэты час зыходзіла з савецкага боку. У Польшчы ішла барацьба паміж прыхільнікамі перамоў і тымі, хто выступаў за працяг вайны. Названы аўтар лічыць, што ў польскіх правячых колах большасць выступала за заключэнне міру [7, с. 171]. Але, на думку С. Кутчэбы, савецкая Расія не імкнулася да дасягнення міру. Яна спадзявалася задаволіць свае інтарэсы з дапамогай ваенных дзеянняў, аб чым сведчыць падрыхтоўка наступлення на Дзвіне. Наступленне Пілсудскага на Кіеў падаецца як польскі адказ на пагрозу савецкага наступлення [7, с. 171–172]. Другія даследчыкі адзначаюць, што савецкая Расія ў канцы 1919 – пачатку 1920 г. прапаноўвала пачаць перамовы на выгадных для Польшчы ўмовах. Я. Чэканоўскі адзначае, што Расія прапаноўвала граніцу па Беразіне [5, с. 65]. Пілсудскі ўбачыў у гэтым спробу толькі выйграць час, каб лепш падрыхтаваць армію для працягу вайны [4, с. 148].

З пытаннем аб граніцах Польшчы на ўсходзе польская гістарыяграфія непарыўна звязвала і даследаванне яе палітыкі на "ўсходніх крэсах". Польская гістарыяграфія і публіцыстыка прыступілі да абгрунтавання права і неабходнасці ўсталявання польскага кантролю над украінскімі, беларускімі і літоўскімі землямі. Адзін з галоўных аргументаў пры гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зводзіўся да таго, што насельніцтва дадзеных тэрыторый не можа стварыць жыццяздольны ўрад. Так, яшчэ ў 1919 г. К. Алендскі пісаў у адной са сваіх работ, што калі б жыхары "ўсходніх крэсаў" і маглі б стварыць свой урад, то "... ўрад гэты быў бы слабым, не абапіраўся б на гістарычныя традыцыі. Без знешняй дапамогі гэты ўрад быў бы няздольны арганізаваць краіну. " Аўтар робіць прагноз, што гэты ўрад усё роўна паў бы. Выйсце з гэтай сітуацыі бачыцца ў тым, каб на "крэсах" стварыць дзяржаву, якая будзе знаходзіцца ў саюзе з Польшчай і абапірацца на яе падтрымку [8, с. 5–7].

Некалькі іншы падыход да вызначэння характару польскай палітыкі на "ўсходніх крэсах" характэрны для В. Каліноўскага. Ён адзначае, што Польшча павінна разглядаць землі Беларусі як поле геапалітычнай барацьбы з Расіяй. Пры гэтым беларускі нацыянальны рух ацэньваецца як надзвычай слабы і няздольны ажыццявіць дзяржаватворчы працэс. Тым не менш, на яго думку, Польшча павінна падтрымаць стварэнне Беларускай дзяржавы ў разліку на тое, што Беларусь пойдзе з тым, хто ёй акажа дапамогу [9, с. 4–6].

С. Кутчэба ў выданні "Незалежная Польшча", якое ўбачыла свет у 1924 г., ажыццяўляе падборку дакументаў такім чынам, каб прадэманстраваць імкненне Ю. Пілсудскага сапраўды даць магчымасць літоўцам, беларусам і ўкраінцам самастойна выбіраць свой лёс [10, с. 8]. Ідэю аб тым, што польская палітыка адпавядала інтарэсам насельніцтва "ўсходніх крэсаў", С. Кутчэба адстойвае і ў сваёй манаграфіі "Адроджаная Польшча". У прыватнасці ён спасылаецца на тое, што польскія ўлады на акупіраванай тэрыторыі Беларусі і Украіны дазвалялі свабоднае карыстанне беларускай і ўкраінскай мовай, у тым ліку і пры звароце ва ўладные структуры [7, с. 163]. Далей названы аўтар аналізуе палітыку федэралізму ў дачыненні да літоўскіх, беларускіх і ўкраінскіх тэрыторый. С. Кутчэба лічыць, што яна была нацэлена на тое, каб адрадзіць Вялікае княства Літоўскае. Яно павінна было ахапіць этнаграфічные літоўскія, беларускія і ўкраінскія тэрыторыі, якія згодна пункту гледжання С. Кутчэбы, былі прасякнуты польскай культурай, насычаны польскай традыцыяй і таму цягацелі да Польшчы. Галоўнае значэнне федэрацыі яму бачылася ў тым, што Польшча мела б унію з моцнымі дзяржавамі і была б аддзелена імі ад Расіі. Найбольш слабым бокам гэтай канцэпцыі С. Кутчэба лічыць тое, што літоўцы пра федэрацыю і чуць нічога не хацелі [7, с. 164–165].

Апошняй спробай рэалізацыі ідэі федэрацыі, на думку С. Кутчэбы, быў паход Пілсудскага на Кіеў. Ён хацеў аддзяліць Украіну ад Расіі і дапамагчы Пятлюры стварыць незалежную ўкраінскую дзяржаву ўзамен за адмову ад прэтэнзій на Усходнюю Галіцыю і частку Усходняй Валыні. Але гэты план Пілсудскага падаецца даследчыку нерэалістычным, бо на Украіне не хапала дзяржаватворчых сіл. Да таго ж, С. Кутчэба лічыць, што адрыванне з польскай дапамогай Украіны ад Расіі назаўсёды сапсавала б адносіны паміж Польшчай і Расіяй [7, с. 173–174].

Характарызуючы канцэпцыю інкарпарацыі, С. Кутчэба ўказвае, што яна грунтавалася на ідэі падзелу беларускіх зямель паміж Польшчай і Расіяй. Яе прыхільнікі мелі на ўвазе далучэнне да Польшчы той часткі Беларусі, на якой была значная доля польскага насельніцтва, пераважалі каталікі і польскі культурны ўплыў Тэрыторыю, на якой пераважалі праваслаўныя беларусы, намячалася аддаць Расіі [7, с. 167]. Гісторык лічыць канцэпцыю інкарпарацыі больш рэалістычнай. Яе перавага заключаецца ў тым, што яна дазваляе Польшчы ўсталяваць добрыя адносіны з Расіяй. А яны неабходны Польшчы ў сувязі з пагрозай з боку Германіі. Пагадненне з Расіяй стане немагчымым для Польшчы, калі апошняя адсуне свае граніцы занадта далёка на ўсход. Да таго ж, буферная дзяржава, якая, згодна федэралісцкай канцэпцыі, павінна ўтварыцца паміж Расіяй і Польшчай, на думку С. Кутчэбы, стане полем пастаяннай барацьбы гэтых дзвюх краін [7, с. 168].

С. Грабскі адзначаў яшчэ адну перавагу палітыкі інкарпарацыі ў параўнанні з канцэпцыяй федэрацыі. На яго думку, трывала ўтрымаць няпольскае насельніцтва ў складзе Польшчы можна толькі праз яго асіміляцыю. Далей польскі палітык падкрэслівае, што палякі павінны выступаць супраць усялякай аўтаноміі ў складзе польскай дзяржавы, бо яна будзе непазбежна весці да росту беларускага, украінскага, нямецкага нацыяналізму [6, с. 26–27]. На думку С. Грабскага, пытанне ўкраінскае і беларускае ў Польшчы – гэта пытанне тэрытарыяльнага аб'яднання дзяржавы. Вырашана яно можа быць толькі праз утварэнне на землях краіны польскай нацыянальнай большасці, ці, як мінімум, перавагі польскага насельніцтва [11, с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

69]. Польскія гісторыкі ўжо ў той час зрабілі выснову, што барацьба дзвюх канцэпцый закончылася перамогай ідэі інкарпарацыі. На думку Я. Чэканоўскага, Рыжскі дагавор канчаткова ўстанавіў, што Польшча будзе дзяржавай нацыянальнай, гэта значыць была пахавана ідэя федэралізму [5, с. 15–16]. У іншых гістарычных даследаваннях адзначаецца, што паражэнне польскіх войскаў летам 1920 г. перакрэсліла федэраліcцкія планы Пілсудскага [4, с. 154].

У польскай гістарыяграфіі важнае месца заняла праблема падпісання Рыжскага дагавора. Польскім аўтарамі адзначаецца, што на пачатку мірных перамоў савецкі ўрад вылучыў вельмі цяжкія для Польшчы ўмовы, такія, якія можна было вылучаць у выпадку ўзяцця Варшавы [4, с. 74]. Далей у ходзе перамоў сітуацыя змянілася. Польскія гісторыкі сцвярджаюць, што савецкая дэлегацыя гатова была ісці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі. Але польская дэлегацыя на перамовах у Рызе прытрымлівалася таго пункту гледжання, што Польшча павінна далучыць толькі тыя землі, якія былі моцна паланізаваны. У сувязі з гэтым палякі адмовіліся ад Мінска [4, с. 178].

Звяртаючыся да гэтай праблемы, С. Грабскі адзначае, што ў час мірных перамоў ён адстойваў пункт гледжання, згодна якому да Польшчы трэба было далучыць на ўсходзе такія тэрыторыі, на якіх за непрацяглы час магла ўтварыцца выразная польская большасць. Таму палякі адмовіліся ад Мінска. С. Грабскі піша, што калі б да Польшчы быў далучаны Мінск і граніца была адсунута далей на ўсход, то ў Польшчы ўзнікла б беларускае пытанне, не менш небяспечнае ўкраінскае [11, с. 70, 72]. Па словах С. Грабскага, у польскай дэлегацыі не было ніводнага чалавека, які думаў бы адсунуць граніцу да Дняпра. Ён тлумачыць гэта перш за ўсё ваеннымі прычынамі. Імкненне да лініі Дняпра азначала б працяг вайны, а за зіму бальшавікі маглі стварыць армію, значна пераўзыходзячую па колькасці польскую. С. Грабскі лічыць, что значна важней, чым дасягнуць лініі Дняпра, для Польшчы было дабіцца агульнай граніцы з Латвіяй, каб аддзяліць Расію ад Літвы [6, с. 105]. Я. Чэканоўскі падкрэсліваў, што па Рыжскаму дагавору Польшча не дасягнула граніцы 1772 г., але значна выйшла за граніцы, дзе польскае насельніцтва складала большасць [5, с. 15–16]. У якасці аднаго з найважнейшых палажэнняў Рыжскага дагавора польская гістарыяграфія адзначае прызнанне незалежнасці Украіны і Беларусі, але пры гэтым звяртае ўвагу на тое, што яны былі цесна звязаны з Расіяй [4, с. 177].

Важнае значэнне Рыжскага міру для Польшчы, на думку полькіх гісторыкаў, заключалася ў тым, што да яго яна разглядалася ў Еўропе як дзяржава, створаная рашэннем пероможцаў. Цяпер яна прадэманстравала сваю сілу і жыццяздольнасць і выступала як найбольш моцная дзяржава на ўсходзе Еўропы. У сувязі з Рыжскім мірам змяніліся і адносіны Францыі да Польшчы. Польшча прадэманстравала сваю сілу і стала рэальным антыгерманскім саюзнікам Францыі. А дзяржавы, якія ўтварыліся на тэрыторыі былой Расійская імперыі, сталі шукаць падтрымкі з боку Польшчы [4, с. 180, 182].

Для польскай гістарыяграфіі даследаванне гісторыі польска-савецкіх адносін было непарыўна звязана з вывучэнне адносін савецка-германскіх. Польская гістарычная навука літаральна з моманту адраджэння незалежнай Польшчы звярнула ўвагу на вялікі ўплыў германскага фактару на развіццё польска-савецкіх адносін. В. Каліноўскі адзначаў, што Германія ва ўмовах Версальскай сістэмы накіроўвае сваю палітыку на збліжэнне з Расіяй. Адпаведна, як адна з важнейшых задач знешняй палітыкі Польшчы вызначалася супрацьстаянне германа-расійскаму блоку. Указаны аўтар лічыць, што дадзеную задачу Польшча можна вырашыць праз стварэнне блока дзяржаў, якія размешчаны паміж Балтыйскім і Чорным морам [9, с. 4–6]. Польскі публіцыст А. Гжымала-Сідлеўскі даказвае, што ўжо ў час пахода Чырвонай арміі на Варшаву ў 1920 г. у польскай грамадскай думцы мелася цвёрдае перакананне, што Расія і Германія могуць выступіць разам супраць Польшчы. Палякі былі ўпэўнены, што немцы толькі чакаюць падзення Варшавы, каб узняць паўстанне ў Гданьску і Верхняй Сілезіі [12, с. 245].

У сілу таго, что Польшча, як лічылі польскія гісторыкі, з двух бакоў акружана ворагамі, яна можа выжыць толькі як вялікая дзяржава. Гэты пункт гледжання ў польскай гістарыяграфіі фарміраваўся ў многім пад уплывам палітыкаў той эпохі. Так, С. Грабскі адзначаў у адным са сваіх твораў, што Польшча ў сілу свайго геаграфічнага становішча можа заставацца незалежнаю толькі тады, калі яна будзе сапраўды вялікаю дзяржаваю, гэта значыць сілаю, з якою кожнаму суседу карысна быць у добрых адносінах [6, с. 6]. Але праблема, на думку С.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Грабскага, заключаецца ў тым, што Масква і Берлін рознымі дарогамі, але скаардынаваўшы агульныя планы, імкнуцца падарваць і знішчыць свет, які "быў усталяваны на развалінах германскага сусветнага панавання" [6, с. 163].

Дакладна так, як у польскай палітыцы, так і ў польскай гістарыяграфіі сфарміравалася дзве пазіцыі адносна таго, хто з вялікіх суседзей Польшчы прадстаўляе для яе большую пагрозу. С. Грабскі як прадстаўнік польскага правага лагеру, даказвае, што Польшча не мае гарантаваных дзесяцігоддзяў міру і найбольш небяспечным яе праціўнікам з'яўляецца Германія [6, с. 113]. Што датычыцца ўсходняга суседа, то зыходным пунктам ацэнкі палітыкі савецкай Расіі ў дачыненні да Польшчы было тое, што яна працягвае ранейшую імперскую палітыку Расіі царскай. Вядомы польскі публіцыст 1920-х гадоў Ф. Канечны пісаў у гэтай сувязі: "Расія – старэйшая мілітарысцкая дзяржава Еўропы, і яна застанецца такой, пакуль не ўспрыме каштоўнасці еўрапейскай цывілізацыі" [13, с. 240].

З другога боку, польскія гісторыкі імкнуліся даказаць, што знешняя палітыка Польшчы пасля Рыжскага дагавора была чыста абарончай. Яна імкнулася захаваць тыя граніцы, якія атрымала па Версальскаму і Рыжскаму дагаворах і не збіралася за іх выходзіць. Адпаведна, яна была зацікаўлена ў захаванні міру [4, с. V, 21].

Для Польшчы знешнепалітычная сітуацыя, якая склалася ў першы час пасля Першай сусветнай вайны, характарызуецца ў польскай гістарыяграфіі як спрыяльная. Гэта звязвалася з тым, што Расія і Германія былі аслаблены. Дадзены перыяд заканчваецца з моманту Генуэзскай канферэнцыі, калі Расія перастала быць толькі аб'ектам міжнароднай палітыкі і стала актыўным яе ўдзельнікам [11, с. 143]. Характарызуючы знешнюю палітыку Польшчы ў час урада В. Сікорскага, С. Грабскі сцвярджае, што Польшча павярнула напрамак сваёй экспансіі ад Балтыкі на Украіну, і гэта была памылка [6, с. 98].

Пэўнае месца ў польскай гістарыяграфіі ў момант яе станаўлення знайшло і пытанне развіцця польска-савецкіх адносін у сувязі з крызісам ў Германіі восенню 1923 г. Даследчыкамі адзначаецца, што восенню 1923 г. германская праблема заняла цэнтральнае месца ў савецка-польскіх адносінах. В. Куманецкі піша, што савецкі бок пры гэтым цікавіла перш за ўсё два моманты: свабода транзіту ў Германію і захаванне нейтралітэту Польшчай у сувязі з германскай рэвалюцыяй. Як лічыць указаны аўтар, кожны з бакоў гатоў быў заставацца нейтральным у адносінах да падзей у Германіі, пакуль такую ж пазіцыю займаў другі бок [14, с. 728–729].

Літаральна па слядах бягучых падзей польскія гісторыкі ў сярэдзіне 1920-х гадоў паспелі правесці першыя даследаванні ўплыву план Дауэса і Лакарнскіх пагадненняў на польска-савецкія адносіны. Б. Боўфал адзначаў, што ў плане Дауса і Лакарнскіх пагадненнях ужо няма дзялення на пераможцаў і пераможаных, што з'яўляецца неспрыяльным фактарам для Польшчы. Акрамя таго, у Лакарна не атрымала ніякага пацверджання ўстаноўленая Версальскім дагаворам германа-польская граніца. На думку аўтара, непажаданную для Польшчы інтэрпрытацыю атрымаў у Лакарна арт. 16 Статута Лігі нацый. У выніку гэтага Германія атрымала магчымасць у новых умовах захаваць Рапальскі дагавор [15, с. 113].

Такім чынам, у першыя гады развіцця гістарыяграфіі польска-савецкіх адносін у адроджанай у 1918 г. Польшчы абазначылася некалькі пытанняў у рамках указаннай праблемы, якім яна надала найбольшую ўвагу. Гэта пытанні гісторыі барацьбы Польшчы за свае ўсходнія граніцы, польска-савецкай вайны 1919 – 1920 гадоў і Рыжскага міру, палітыкі Польшчы на літоўскіх, украінскіх і беларускіх землях, уплыву германскага фактара на польска-савецкія адносіны. У той час пералічаныя пытанні мелі выключную палітычную актуальнасць. Гэта наклала вялікі адбітак на характар навуковых даследаванняў, якія неслі на сябе след вострай ідэйна-палітычнай барацьбы. Пералічаныя абставіны набліжалі польскую гістарыяграфію даследуемага часу да публіцыстыкі.

**Резюме.** В статье рассмотрен первый этап развития историографии польско-советских отношений в Польше после ее восстановления как независимого государства в 1918 г. Выявлены важнейшие вопросы, на которых акцентировала свое внимание в рамках указанной проблемы польская историография периода 1918–1926 годов: история становления восточной гра-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ницы Польши, польско-советской войны 1919 – 1920 годов и подписания Рижского мира, политика Польши в отношении литовских, белорусских и украинских земель, влияние германского фактора на польско-советские отношения. Показано, что развитие исторической науки в Польше в тот период было неразрывно связано с решением стоявших перед страной внешнеполитических задач.

**Abstract.** The first stage of Poland-Soviet development relation historiography after its restoration as an independent state in 1918 is considered in the article. The major questions on which Polish historiography focused its attention within the limits of the specified period (1918-1926) are revealed: the history of Eastern Poland border formation, Poland-Soviet war of 1919-1920 and signing an armistice in Riga, Poland's policy towards the Lithuanian, Belarusian and Ukrainian lands, the German factor influence on Poland-Soviet relations. It is shown that the development of a historical science in Poland was during this period inseparably linked with the decision of foreign policy problems facing the country.

**Літаратура**

1 Зашкильняк, Л. А. Формирование и развитие исторической науки в Польше / Л. А. Зашкильняк. – Львов: ЛГУ, 1986. – 82 с.

2 Ольшанский, П. Н. Рижский договор и развитие советско-польских отношений. 1921 – 1924 / П. Н. Ольшанский. – М.: Наука, 1974. – 288 с.

3 Михутина, И. В. Советско-польские отношения. 1931-1935 / И. В. Михутина. – М.: Наука, 1977. – 288 с.

4 Wskreszenie Panstwa Polskiego. Szkic historyczny. T. 2. 1918 – 1923. – Krakow: Krakowska Supolka Wydawecka, 1925. – 300 s.

5 Czekanowski, J. Wschodni zagadnienia graniczne Polski i stosunki etniczno-społeczne. / J. Czekanowski. – Lwow, 1921. – 144 s.

6 Grabski, с. Z zagadnień polityki narodowo-państwowej. / S. Grabski. – Warszawa: Wyd. Perzynski, Niklewicz i s-ka, 1925. – 134 s.

7 Kutrzeba, с. Polska odrodzona. 1914 - 1922. / S. Kutrzeba. – Krakow: Gebethner i Wolff, 1922. – 264 s.

8 Olędzki, K. Kresy wschodnie a Polska. / K. Olędzki – Warszawa: Druk. J. Swiętòńskiego, 1919. – 14 s.

9 Kalinowski, W. Kwesta wschodnia a Białorus. / W. Kalinowski. – Warszawa: Druk. Lit., 1920. – 14 s.

10 Kutrzeba, с. Polska niepodlegla. / S. Kutrzeba – Krakow: Krakowska Spòłka Wydawecka, 1924. – 32 s.

11 Grabski, с. Uwagi o bieżącej historycznej chwili Poski. / S. Grabski – Warszawa: Wyd. Perzyński, Niklewicz i s-ka, 1922. – 160 s.

12 Grzymala-Siedlewski, A. Cud Wisly. Wspominy korespondenta wojennogo. / A. Grzymala-Siedlewski. – Warszawa: Wyd. Perzyński, Niklewicz i s-ka, 1921. – 278 s.

13 Koneczny, F. Polski lagos a etnos. / F. Koneczny – Warszawa, 1921 – 315 s.

14 Kumanecki, W. Odbudowa panstwowosci Polskiej. / W. Kumanecki – Warszawa – Krakow, 1924. – 784 s.

15 Bouffal, B. Uklady w Lokarno a bezpiezeństwo Polski. / B. Bouffal – Warszawa: Wyd. Perzyński, Niklewicz i s-ka, 1926. – 134 s.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 21.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ